9. *Цивьян, Т. В.* «Дом» в фольклорной модели мира (на материале балканских загадок) / Т. В. Цивьян // Труды по знаковым системам 10. – Тарту, 1978. – С. 72.

10. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. / П. В. Шейн. – СПб., 1902. – С. 156.

11. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / рэд. І. Шамякін [і інш.]. – Мінск, 1989. – С. 33–34.

М. М. САКАЛОЎСКАЯ

## ТВОРЧАЕ ПАРТНЁРСТВА ФЛАРЫЯНА МІЛАДОЎСКАГА І БЕНЯДЗІКТА ТЫШКЕВІЧА

Дабратворны ўплыў мецэнацкай дзейнасці графа Б. Э. Тышкевіча адчуў беларускі кампазітар Фларыян Фабіянавіч Міладоўскі (1819–1889), які па праву лічыцца адным з заснавальнікаў айчыннай прафесійнай музычнай культуры. Бацька Фларыяна, шляхціч Фабіян, валодаў фальваркам Навадворкі каля Навагрудка, але з цягам часу страціў уладанне і быў вымушаны перабрацца ў Мінск і зарабляць грошы ўрокамі музыкі [2]. Тут і нарадзіўся будучы знакаміты кампазітар. Бацька, заўважыўшы здольнасці сына да музыкі, пачаў фарміраваць у яго навыкі музычнай граматы і ўменні фартэпіяннай ігры. Далейшае развіцце музычнага майстэрства адбывалася ў Вільні пад кіраўніцтвам вядомага педагога-піяніста Фердынанда Цібэ. Вучоба ў Цібэ прынесла шмат карысці Фларыяну, аб чым сведчыць першы публічны канцэрт, які ў маі 1829 г. у Вільні даў дзесяцігадовы піяніст. У праграме канцэрта былі складаныя музычныя творы: Сёмы канцэрт для фартэпіяна Д. Г. Штэйбельта і Варыяцыі К. Чэрні. Тагачасная прэса адзначыла, што ў ігры юнага музыканта адчуваліся вялікія здольнасці, незвычайная смеласць, прысутнасць духу, дакладнасць рытму, бегласць і пачуццё [3]. У віленскі перыяд у Ф. Міладоўскага праявіўся і кампазітарскі талент. Яго мазуркі, вальсы, паланэзы, контрадансы, мініяцюры карысталіся вялікай папулярнасцю ў колах творчай эліты Віленшчыны.

Бацька, які пільна сачыў за поспехамі сына, зразумеў, што Фларыян ужо пераўзышоў свайго настаўніка. Для далейшага развіцця яго музычных здольнасцей патрэбен больш вопытны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

настаўнік. Вырашана было звярнуцца да Дамініка Стэфановіча (1797–1871), аднаго з самых адукаваных музыкантаў таго часу [1]. Плённая педагагічная дзейнасць Д. Стэфановіча ў Мінску мела вялікае значэннэ для развіцця беларускай музыкальнай культуры. Галоўная яго заслуга ў тым, што ён садзейнічаў распаўсюджанню музычнай асветы ў Беларусі. У «Прыватным жаночым пансіёне» Стэфановіча (дзейнічаў у Мінску з 1848 г.) вучні атрымлівалі не толькі агульную, але і паўнавартасную музычную адукацыю. Праслухаўшы Фларыяна, педагог адразу пагадзіўся прыняць яго ў лік сваіх вучняў. Дарэчы, сярод іх ужо былі С. Манюшка, К. Марцынкевіч. Творчая індывідуальнасць Міладоўскага сфарміравалася пад уплывам Д. Стэфановіча, які не толькі кіраваў музычнымі заняткамі свайго вучня, але прывіў яму сапраўдную любоў да музыкі. Адносіны юнака да мастацтва сталі больш сур'ёзнымі, ён пачынае ўсведамляць неабходнасць пастаяннага і настойлівага ўдасканалення выканальніцкага майстэрства.

У пачатку 1830-х гг. Ф. Міладоўскі ўжо дасягнуў высокага артыстычнага ўзроўню, аб чым сведчаць канцэрты, якія з поспехам праходзілі ў Вільні, Мінску, Слуцку і іншых гарадах Беларусі. У гэты перыяд на сваім творчым шляху Ф. Міладоўскаму пашчасціла сустрэць вядомага італьянскага спевака Джузепе Банольдзі, які з італьянскім тэмпераментам акунаецца ў культурнае жыццё Вільні. Сучаснікі сведчаць, што ён валодаў багацейшай гамай інтанацыйных нюансаў, гумарам і драматызмам ігры. Ён падтрымлівае творчыя адносіны з шэрагам беларускіх кампазітараў і выканаўцаў. Таленавітаму спеваку вельмі падабалася выконваць творы пачынаючых тагачасных кампазітараў Фларыяна Міладоўскага і Станіслава Манюшкі, якія былі вельмі ўдзячны Банольдзі за папулярызацыю іх творчасці. У падзяку Міладоўскі прысвячае яму адзін са сваіх зборнікаў рамансаў.

На адным з канцэртаў талент Фларыяна заўважыў і ацаніў Бенядзікт Эмануіл Тышкевіч і ў 1836 г. запрасіў яго ў Чырвоны Двор у якасці настаўніка музыкі для сваіх дачок. Сам граф быў аматарам класічнай музыкі і марыў аб стварэнні ўласнага сімфанічнага аркестра. Ён падзяліўся сваімі думкамі з Фларыянам, які горача падтрымаў ідэю графа і выказаў жаданне стаць дырыжорам аркестра. З мясцовых і нямецкіх музыкаў у хуткім



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часе маладому дырыжору ўдалося ўкамплектаваць склад аркестра, падабраць цікавы рэпертуар і дабіцца высокага выканальніцкага ўзроўню. Музыказнаўцы сведчаць, што аркестр пад кіраўніцтвам Міладоўскага за кароткі час зрабіўся адным з лепшых сімфанічных калектываў Еўропы, бездакорна выконваў сімфоніі Бетховена, Моцарта, Шуберта, тагачасныя новыя творы сімфанічнай і інструментальнай музыкі. Кампазітар і сам стварыў для аркестра шэраг буйных музычных твораў. Для музычнага тэатра, які існаваў у Чырвоным Двары, Ф. Міладоўскі напісаў некалькі аперэт. Граф і графіня Тышкевічы маральна і матэрыяльна заахвочвалі творчую дзейнасць беларускага кампазітара, якая працягвалася да 1841 г.

Засвойваючы ў юнацкім узросце выканальніцкае майстэрства ў Д. Стэфновіча, Фларыян пасябраваў з С. Манюшкам, які таксама быў вучнем таленавітага педагога. Станіслаў усё жыцце сачыў за музычнай творчасцю Міладоўскага і даваў яму слушныя парады. Вось і цяпер ён параіў спыніць на час музычную дзейнасць у Чырвоным Двары і накіравацца ў Еўропу з мэтай удасканалення кампазіцыйнага майстэрства. Безумоўна, графу Бенядзікту шкада было развітвацца з маэстрам, але мецэнат зразумеў важнасць такога кроку і не толькі не прешкаджаў яго здяйсненню, але нават узяў на сябе ўсе выдаткі, звязаныя з пражываннем Фларыяна ў Еўропе. Два гады ў лепшых тагачасных еўрапейскіх кампазітараў і выканаўцаў Міладоўскі ўдасканальваў музычную адукацыю. Яму пашчасціла спасцігаць майстэрства кампазіцыі ў Ф. Мендэльсона, які шмат увагі надаваў беларускаму кампазітару і неаднаразова дапамагаў слушнамі парадамі, у тым ліку параіў наведаць Вену, дзе можна было пазнаёміцца з творчасцю вядомых еўрапейскіх музыкаў. Сапраўды, на сродкі Б. Тышкевіча ён сумеў браць урокі па гармоніі і паліфоніі ў Ф. Хельтцля і С. Зехцера, па вакалу і кантрапункту ў І. Фішхофа [2, с. 449].

У 1843 г. Ф. Міладоўскі вяртаецца ў Чырвоны Двор, дзе Тышкевічы стварылі спрыяльныя ўмовы для яго творчасці. Дзякуючы такім клопатам, ён змог шмат часу аддаваць кампазіцыі, займацца педагагічнай дзейнасцю. Не пакінуў без увагі Міладоўскі і сваё дзецішча – аркестр. Ім ён кіраваў да апошніх дзён знаходжання ў Чырвоным Двары. Дарэчы, тут наш суайчыннік пазнаёміўся з настаўніцай французскай мовы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўгусцінай Паро, якая стала яго жонкай. Шкада, але шчодры апякун талентаў неўзабаве страціў свае сродкі, палацава-паркавы ансамбль паступова заняпаў, прыйшлося рэзка скараціць выдаткі на мастацкую і асветніцкую дзейнасць і нават расфарміраваць творчы калектыў аркестра.

Ф. Міладоўскі з сумам у 1851 г. ад'язджае з Чырвонага Двара. С. Манюшка запрашае кампазітара ў Вільню, дзе музычная творчасць сябраў плённа працягваецца. Вядомы літаратурны і музычны крытык XIX ст. А. Жалязняк аб віленскім перыядзе творчасці Міладоўскага пісаў: «Ён і Манюшка да цяперашняга часу былі ў Літве дзвюма пальмамі ў выпаленай пустыні, пад якімі музыка мела магчымасць знайсці сабе прытулак» [4, с. 67].

У сярэдзіне 1850-х гг. Ф. Міладоўскі разам з сям'ёй вяртаецца на радзіму, у невялікую маляўнічую весачку Мацкі на беразе ракі Вяча, каля Мінска. Тут ён, абапіраючыся на веды, набытыя ў лепшых музыкантаў Еўропы, стварае аперэту «Канкурэнты» на тэкст М. Лапіцкага і У. Сыракомлі, прэм'ера якой адбылася ў Мінску ў лютым 1861 г. Творчая актыўнасць кампазітара ў мінскі перыяд дасягнула сваёй вяршыні. У Мацках Міладоўскі стварае цыкл песень на вершы польскіх паэтаў Яна Прусіноўскага і Уладзіміра Вольскага, вядомы пад назвай «Польскія напевы». У гэты ж час ім напісана мноства фартэпіянных сачыненняў, у тым ліку «Экспромт», надрукаваны Ф. Лістам у Штутгарцэ, чатыры мазуркі і Паланэз B-dur (выдадзены ў Парыжы), тры мазуркі (выдадзеныя ў Варшаве), прысвечаныя С. Манюшка. У планах Ф. Міладоўскага было стварэнне оперы, шкада, але па шэрагу прычын праект не атрымалася ажыццявіць.

У 1862 г. кампазітар з сям'ёй эмігрыраваў ў Францыю, дзе пражываў ў гарадах Метц, Сан-Клемент, Нансі, Бардо. Пэўны час ён з'яўляўся прафесарам фартэпіяннай ігры ў Вышэйшай музычнай школе, займаўся кампазіцыяй, за мяжой Ф. Міладоўскім створаны цыкл з 12 дуэтаў для віяланчэлі і фартэпіяна «Альбом сляпога».

1. *Капилов, А. Л.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков / А. Л. Капилов, Е. И. Ахвердова. – Минск : Институт современных знаний, 2000. – 144 с.

2. Echo Myzeczne, Teatralne I Artystyczne. – 1980. – № 312. – S. 449.

3. Kurier Litewski. – 1829. – № 59. – S. 14.

4. *Zelezniak, A.* Gubernia minska pod wzgedem muzykalnym // Ruch Myzyczny. – 1858. – № 50. – S. 67.

П. М. САПОЦЬКА

# ДА ГІСТОРЫІ ПЕРШАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЛІТОЎСКАГА СПЕКТАКЛЯ «АМЕРЫКА Ў ЛАЗНІ»




Гісторыя літоўскага тэатра, якая распачалася ў XVI ст., прайшла мноства этапаў свайго развіцця: пастаноўкі ў старажытных замках з удзелам замежных акцёраў, драматычныя, оперныя і балетныя трупы пры дварах князёў і вяльможаў, гарадскі тэатр, падпольны тэатр і таемныя літоўскія вечары, аматарскія групы і драматычныя гурткі, прафесійны тэатр.

Адной з найважнейшых вех у гісторыі тэатральнага мастацтва Літвы з'яўляецца пастаноўка першага спектакля на літоўскай мове «Амерыка ў лазні» («У Амерыку», «Амерыка жаданая») па п'есе Юозаса Вілкутайціса-Кятуракіса ў Паланзе.

Палангу ў 1824 г. набылі графы Тышкевічы, якія ўзвялі тут палац у стылі неарэнесанса, разбілі парк, запрасіўшы для гэтага вядомага французскага ландшафтнага архітэктара Эдуарда Франсуа Андрэ. Таксама былі пабудаваны летні тэатр, некалькі дачных кварталаў, лячэбніцы, купальні, кандытарскія, гімнастычная зала. Тым самым Тышкевічы стварылі адзін з найбуйнейшых культурных і эканамічных цэнтраў Літвы і Еўропы.

Камедыя-вадэвіль Вілкутайціса-Кятуракіса высмейвае людзей, якія жадаюць эміграваць у Амерыку. Галоўны герой вадэвіля – сельскі кравец Вінцас – прапануе аднаму заможнаму земляробу Антанасу пазычыць свайму збяднеламу суседу некалькі тысяч рублёў і атрымаць за гэта ў жонкі яго дачку Аготу з вялікім пасагам, пасля прапанаваўшы апошняй скрасці гэтыя грошы і разам бегчы ў Амерыку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ